# Рэдкае выданне ад сына Змітрака Бядулі

Нацыянальную бібліятэку Беларусі наведаў сын класіка беларускай літаратуры Змітрака Бядулі – Яфім Самуілавіч Плаўнік. Сёлета адзначаецца 135-годдзе вядомага пісьменніка, чые творы ўваходзяць у школьную праграму і рэгулярна перавыдаюцца цягам ужо больш як ста гадоў. Аднак далёка не ўсе прыжыццёвыя выданні Змітрака Бядулі зберагліся нават у фондах галоўнай бібліятэкі краіны. Адным з іх была і кніга «Танзілія», выпушчаная літаратурным аб'яднаннем «Узвышша» ў 1927 г. Менавіта гэтае выданне Яфім Самуілавіч разам з жонкай перадалі ў дар Нацыянальнай бібліятэцы, суправадзіўшы яго адпаведным дарчым надпісам.



Алесь Суша і Яфім Плаўнік з жонкай

Творчае знаёмства бібліятэкі з сям'ёй Змітрака Бядулі асабліва актывізавалася ў гэтым, юбілейным, годзе: 27 студзеня адбыўся навукова-практычны семінар «Шляхамі маладнякоўцаў», 15 красавіка ў зале беларускай літаратуры адкрылася выстава «Беларускі салавей», 23 красавіка бібліятэка прадставіла ўнікальныя дакументы для выставы ў «Беларускай хатцы», 29 красавіка ў бібліятэцы адбыўся юбілейны круглы стол «Беларускі салавей», а на восень запланаваны конкурс для маладых беларускіх творцаў. У многіх мерапрыемствах Яфім Самуілавіч асабіста браў удзел.

Празаічны зборнік Змітрака Бядулі «Танзілія» доўгія дзесяцігоддзі захоўваўся ў сям'і пісьменніка, а цяпер папоўніць фонды Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і вельмі хутка трапіць да сваіх новых чытачоў.

***Паводле паведамлення НББ.***
***Фота з партала nlb.by***






ТАНЗІЛІЯ

НОВЭЛІ

Супрацоўнікам найлепшай,
неверагоднай бібліятэцы
на добрую памяць
ад сына Змітрака Бядулі.
Е. С. Плаўнік.
18 мая 2021 г.